УДК 745.04:39(=161.3):72.03

# АХАВАЛЬНА-ДЭКАРАТЫЎНЫЯ МАТЫВЫ Ў БЕЛАРУСКІМ НАРОДНЫМ ДОЙЛІДСТВЕ

***Хіцько І.П.***
*ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

***Ключавыя словы:*** *эстэтычна-магічныя знакі, сімвалы "ахоўнікі", народнае дойлідства, міфалогія.*

У беларусскім народным дойлідстве захаваліся элементы дэкору, што сваімі каранямі сягаюць у глябіні сімволікі Старажытнай Русі.

Распаўсюджаныя ў старажытнасці эстэтычна-магічныя знакі, што ператварыліся пазней у эстэтычныя сімвалы, шырока бытуюць у наш час у вырабах з металу, тканінах, кераміцы, резьбярстве і народным дойлідстве.

Пад уплывам шматлікіх перажыткаў язычніцтва ўзнікла тэндэнцыя ўвасабляць у розных бытавых вырабах і дойлідстве ўзоры так званых "ахаванняу" ("оберегов"). Пра магічныя і эстэтычныя функцііі "ахаванняў" старажытнай пары сведчаць упрыгожванні і прадметы побыту X–XIII ст.ст. У старажытнасці людзі атаясамлівалі прагожае і добрае, што выявілася ў стварэнні розных упрыгожанняў, аздабленняў з сімваламі "ахоўнікаў". Пастутова рялігійны змест выцясняўся, і заставалася прагожая, выразная форма [1].

Міфалагічная заклінальная сімволіка язычніцтва нават пасля прыняцця хрысціянства яшчэ доўга жыла ў народзе, асасбліва ў весцы, дзе эканамічная і культурная замкненасць, патрыярхальнасць побыту спрыялі захаванню старажытных звычаяў. У сучасным народным дойлідстве сустракаюцца дэкаратыўныя элементы, што дайшлі да нас з часоў далекай старажятнасці, – гэта выявы нябесных свяціл, жывел, птушак, раслін.

У розных народаў магічныя функцыі прыпісваліся пэўным жывелам, птушкам, раслінам – своеасаблівым "тотэмам" гэтых народаў. Для бларусаў імі былі конь, карова, певень [2].

"На першым месцы тут стаіць амаль што паўсюды певень, аб якім многа гаварыць не трэба: певень лічыцца птушкай, якая адганяе сваім пяяннем нячыстую сілу і наогул мае здольнасць аберагаць ад усякага ліха… Апрача пеўня, такімі ж жывеламі лічацца бык або карова і конь… Конь, як абаронца ад ліха, не страціў да гэтага часу сваей ролі" [2] – пісаў акадэмік Нікольскі у 1933 г.

У міфалогіі Грыма гаворыцца, што паміж усімі ахвяраваннямі прынясенне ў ахвяру каня шмат у якіх народаў было самае важнае і ўрачыстае. Конская галава або чэрап каня, прымацаваныя на страсе або на жэрдцы каля жытла, у часы язычніцтва былі распаўсюджанай з'явай і мелі рытуальна абрадавае значэнне. А певень або курыца былі ў асаблівай пашане ў славян і адыгрывалі важную ролю ў народнай абраднасці. Яны былі абавязковай часткаю вясельнага рытуалу; без прынясення ў ахвяру пеўня не абходзілася ніводнае пахаванне нябожчыка; рабілася гэта і пры закладзінах новай хаты. Прычым прынесеная ў ахвяру птушка прымацоўвалася на самым высокім і ганаровым месцы, што пазней у якасці сімвала перайшло ў драўлянае і мураванае народнае дойлідства. Што датычыцца сімметрычнай здвоенасці сімвала, дык яно было адной з улюбёных форм старажытнага свету. У архітэктуры гэта знайшло выяўленне ў выглядзе здвоенных і часам адзіночных "канькоў" (вільчыкаў). Найбольш старыжытнымі кампазіцыямі вільчыкаў на Беларусі лічацца здвоенныя выявы галоў жывелін, птушак або рагоў. Здвоеная кампазіцыя была абумоўлена і канструкцыяй двухсхільнага даху, калі наверсе ўтваралася крыжавіна з двух прычолкаў. "Рогі" гэтых прычолкаў і



Рэпазіторый ВДУ

апрацоўваліся ў выглядзе сімвалаў зааморфнага або “нябеснага” паходжання [3]. З удасканаленнем тэхнікі будавання мянялася фасадная частка завяршэння даху, што адбывалася і на форме сімвалаў. А страціўшы рэлігійнае значэнне, яны набылі наогул самыя разнастайныя канфігурацыі, адлюстроўваючы часам геральдыку або прадметы побыту.

У сучасным архітэктурным дэкоры выразна прасочваецца наватарская пераемнасць народных традыцый. Аднак і цяпер яшчэ можна вылучыць пэўныя рэгіёны бытавання старажытных сімвалічных элементаў народнага дойлідства. Гэта Капыльскі, Клецкі, Уздзенскі, Слуцкі, Нясвіжскі і Стаўбцоўскі раёны Мінскай вобласці, Лельчыцкі і Жыткавіцкі Гомельскай вобласці, Столінскі, Івацэвіцкі, Пінскі і Пружанскі Брэсцкай вобласці, Дзятлаўскі, Навагрудскі, Шчучынскі, Карэліцкі раёны Гродзенскай вобласці. Пераважная большасць вільчыкаў выканана спосабам контурнага выпілоўвання з захаваннем у сілуэце характэрных прыкмет вобраза-сімвала. Сучасныя вільчыкі простых форм у выглядзе трохкутнікаў, ромбаў і да т.п. сустракаюцца па ўсёй Беларусі, але найбольшай разнастайнасцю форм вылучаюцца паўночны ўсход Віцебшчыны, поўдзень Міншчыны і паўночны ўсход Гомельшчыны [5].

Старажытныя раслінныя і жывельныя матывы дэкору шырока скарыстоўваліся ў пару сярэднявечча пры ўвядзенні княскіх і баярскіх харомаў; у XVI–XIX ст.ст. адмысловымі элементамі разбянога дэкору самабытныя мастакі з народу аздаблялі іканастасы і алтары цэркваў і касцелаў. У народным дойлідстве горада раслінныя і жывельныя кампазіцыі набылі шырокую вядомасць ў XIX ст., а пры ўзвядзенні вясковых хат гэтымі аздабленнямі ўпрыгожвалі жытло з канца XIX – пачатку XX ст. Прычым стылізаваныя вобразы жывел і птушак, апроч вільчыкаў, сустракаюцца на аконных ліштвах, на брамах, дзвярах, вуглах хат, шчытах. У даследаванні “Жывелы ў звычаях, абрадах і вераваннях беларускага сялянства” М.Н. Нікольскі пісаў: “У дадатак да апатрапеяў на дахах робяцца беларусамі таксама апатрапейныя вобразы жывел і птушак на вокнах, праз якія могуць уляцець у хату злыя духі. Вобразы робяцца плоскія, разныя і змяшчаюцца звычайна над верхнім налічнікам аконнае рамы” [2].

У пачатку XX ст. падобныя з’явы выявіў І.А. Сербаў у Хойніцкім раёне Гомельскай вобласці. А паводле слоў акадэміка Нікольскага, этнаграфічныя экспідыцыі 1923–1929 гг. выявілі бытаванне гэтых вобразаў па ўсёй Беларусі [3].

“Добрая” птушка ў фальклоры заўсёды сімвалізавала добры пачатак. Што ж да кампазіцыйнай будовы дэкору беларускага народнага жытла, дык, апроч амаль абавязковай парнасці, для такіх капмазіцый характэрная і сіметрычнасць. Сіметрыя размяшчэння птушак на плоскасці бывае самая разнастайная – птушкі сядзяць ў гнездах, стаяць, але амаль заўсёды яны павернуты галовамі адна да другой. У якасці злучальнага элемента паміж птушкамі сустракаюцца дрэва, кветка, вазон або сімвал сонца. Часам сустракаюцца выявы птушак і птушанят, птушак і звяроў. Характарная асаблівасць гэтага віду дэкору – профільнае адлюстраванне, што абумоўлена тэхнікай контурнага выпілоўвання, часам дапоўненага скразной прапілоўкай, паглыбленым або скразным свідраваннем. Тэхніка контурнага выпілоўвання патрабуе стварэння выразнага сілуэту, які б добра глядзеўся на адлегласці. Колер расфарбоўвання найчасцей выбіраецца кантрастны ў параўнанні з асноўным колерам афарбоўкі сцен.

Часам у выяўленчым дэкоры жывёльныя матывы даводзяцца да такой ступені стылізацыі, што ператвараюцца ў мудрагелістыя раслінныя формы. Гэта асабліва прыкметна на ўзорах разьбы з Гомельшчыны.

Асобае месца сярод “ахоўнікаў” у беларусаў некалі займалі змеі. Асабліва ў раёнах Палесся людзі шанавалі вужоў. Бытавала нават павер’е, што калі вуж пакіне хату, там неўзабаве здарыцца няшчасце. У дэкоры народнага дойлідства выявы змей найчасцей змяшчалі на верхняй частцы ліштваў. Галовамі яны павернуты да цэнтра або глядзяць у розныя бакі. Часам да змяінага тулава “прамацоўвалі” птушыную галаву.

Рэпазіторый ВДУ

Найбольшае распаўсюджанне выявы звяроў і птушак набылі ў Слонімскім, Дзятлаўскім, Навагрудскім раёнах Гродзенскай вобласці, Івацэвіцкім, Пружанскім раёнах Брэсцкай вобласці, Смалявіцкім, Лагойскім, Уздзенскім, Слуцкім, Стаўбцоўскім, Нясвіжскім, Валожынскім раёнах Мінскай вобласці, Брагінскім, Хойніцкім, Нараўлянскім раёнах Гомельскай вобласці, Краснапольскім, Хоцімскім, Магілёўскім, Шклоўскім раёнах Магілёўскай вобласці. А поўночна-ўсходнія раёны Гомельскай вобласці па левы бок Дняпра і Мазыршчына сваім пышным, ажурным дэкорам паўтараюць узоры сярэдняй паласы Расіі і Падмаскоўя. Сустракаюцца падобныя ўзоры ў шмат якіх драўляных збудаваннях гг. Віцебска і Магілёва [5].

Калі зааморфныя вобразы на розных канструкцыйных дэталях народнага дойлідства сустракаюцца спарадычна або асобнымі ачагамі, дык старажытныя вільчыкі ў выглядзе галоў жывелін, птушак або рагоў – адметная асаблівасць Случчыны [5].

Сярод сімвалічных элементаў мінулага, якім надавалася магічнае значэнне і якія захаваліся да нашага часу ў выглядзе элементаў дэкору ў ткацтве, вышыўцы, кераміцы, народным дойлідстве, значнае месца занімаюць узоры-сімвалы нябесных свяціл. На аснове вывучэння археалагічных, этнаграфічных і гістарычных матэрыялаў даследчыкамі розных краін было выяўлена, што ў якасці сімвалаў сонца найчасцей сустракаюцца колы, зоркі, разеткі, ромбы. Найбольш старажытныя сімвалы сонца ў народнай архітэктуры – круг, дыск або паўдыск з прамянямі ці пялесткамі, разеткі і больш познія трансфармацыі – ромбы, квадраты і іншыя формы [4].

Гэтыя ўзоры шырока ўласцівы і беларускаму народнаму дойлідству. У наш час яны набылі значэнне чыста дэкаратыўных элементаў, якімі карыстаюцца для аздаблення драўляных будынкаў. Так, шырока выкарыстоўваецца сімвал сонца пры шалёўцы дашчанага франтона. Часта нябеснае свяціла паказваецца ў выглязе трайной кампазіцыі – ранак, поўдзень і вечар, калі цэнтральную, верхнюю частку франтона займае дыск ці паўдыск, а ніжэй па баках, размяшчаюцца паўдыскі ці чвэрткі дыскаў. Часам сімвал сонца набіраецца з шалевачных досак або накладваецца з рэек ў выглядзе ромба ці квадрата. Разнавіднасцю франтона з наборным і накладным дэкорам у выглядзе сонца з'яуляецца невялікі навясны "брылёк"-франтон. Падобныя архітэктурныя элементы сустракаюцца ў заходніх раёнах Віцебскай вобласці, у паўночна заходніх і паўднёвых раёнах Мінскай, у Гродзенскай і Брэсцкай абласцях.

Старажытнымі сімваламі сонца з'яўляюцца чатырохпялёсткавыя замкненыя і востраканечныя разеткі, якімі аздабляецца франтон, уваход, сцены, ліштвы. У аснову чатырохпялесткавай разеткі пакладены крыж. Крыж як сімвал агню і сонца быў на тэрыторыі Беларусі яшчэ ў часы язычніцтва. У народных павер'ях агонь лічыўся ачышчальнай сілай ад шкодных духаў. У хрысціян сімвалам нябеснага і зямнога агню, які распаўсюджвае "цудатворнае" дзеянне на ўсе чатыры бакі, стаў крыж, пісаў Н.М. Нікольскі [1].

Гэты элемент шырока быў распаўсюджаны і ў народным дойлідстве беларусаў. Крыж малявалі на ліштвах, дзвярах, на фасадзе, выразалі з дрэва і ўмацоўвалі над франтонам, ставілі пры ўездзе ў паселішча. Крыж у крузе сімвалізаваў адзінства зямнога агню і нябеснага свяціла. У народнай інтэрпрэтацыі ен ператварыўся ў чатырохпялёсткавую кветку, а пазней – у кветку ў крузе і іншыя варыянты разетак. Кветкавая разетка ўвасабляла адзінства сонечнай цеплыні, траў і кветак [4]. У сучаснай архітэктуры разетка як дэкаратыўны элемент шырока выкарыстоўваецца пры аздабленні франтонаў, дзвярэй, вокнаў, веснічак, брам.

Этнаграфічныя экспедыцыі 20–30-х. гг. зафіксавалі распаўсюджанне сонечных разетак на франтоне ў Лельчыцкім і Тураўскім раёнах Гомельскай вобласці і ў Слоімскім раёне Гродзенскай вобласці, а ў наш час яны ўжываюцца пры аздабленні жылля на Палессі (ад Лельчыц да Івацэвіч). Разеткі сустракаюцца ў Шклоўскім раёне



Репозиторий ВГУ

Магілёўскай вобласці, асабліва ў самім Шклове, на драўляных будынках XIX–XX ст. у Магілеве і яго наваколлі. Чатырохпялёсткавыя і круглыя разеткі-зоркі ёсць у Віцебскім і Гарадоцкім раёнах Віцебскай вобласці.

Значэнне круга-засцерагальніка ў беларусаў, як і ў іншых народаў, прасочваецца нават у пачатку XX ст. Так, у матэрыялах экспедыцыі 1932 г. па Беларускаму Палессю А. Супінскі адзначаў, што палешукі вырэзвалі на закрылінах даху кругі, падзеленыя радыусам ці крыжам, – т. зв. "перуновыя знакі", якія нібыта ахоўвалі жыллё ад маланкі.

Круг і кола часта ўспрымаліся старажытнымі славянамі як сімвал сонца. Асабліва распаўсюджана было кола з мноствам спіц-прамянёў. У разьбе па дрэву такое кола называлася "ззяннем". Гэты элемент дэкору шырока распаўсюджаны і ў наш час. Адзін з варыянтаў "ззяння" – кола-разетка з загнутымі прамянямі, якія надаюць колу выгляд руху ў бок выгіну прамянёў ( т.зв. " сегнерава кола" ). У архітэктурным дэкоры сустракаецца палова " ззяння", чацвертая частка і іншыя яго камбінацыі, выканвныя спосабам трохгранна-выемкавай разьбы.

Найбольш характэрны для архітэктурнага дэкору сярэдняй паласы і поўначы Расіі, на Беларусь гэты элемент аздаблення трапіў, відаць, дзякуючы сталярам-рамеснікам XIX – пачатку XX ст., якія выконвалі заказы па архітэктурнаму аздабленню будынкаў, галоўным чынам у гарадах. Размяшчаліся "ззянні" па шаляваных выступах вуглоў, на верхняй або – радзей – ніжняй частцы, ліштваў, на парадных дзвярах і г.д. У сучасным дэкоры падобныя разеткі распаўсюджаны ў левадняпроўскім рэгіёне Гомельшчыны, дзе сустракаюцца на верхняй частцы ліштваў і на дзвярах.

Вучоныя многіх краін лічаць, што сімвал сонца пачаў набываць рамбавідную форму спачатку ў ткацтве (так патрабавала тэхналогія ткацтва), а потым гэтыя выяўленчыя формы трапілі і ў народнае дойлідства. З часу масавага распаўсюджвання пілы і пранікнення яе ў веску аб'ёмнымі сімваламі сонца ў дэкараванні жылля выступаюць не толькі круг, дыск, разетка, але і ромб з квадратам, бо іх легка было выпілоўваць з дрэва. Тэхналогія шалёўкі спрыяла з'яўленню квадратных і рамбавідных форм на франтонах і сценах хат пачынаючы з XVII ст. Распаўсюджаны таксама накладныя рамбавідныя і квадратныя сімвалы. Іх размяшчаюць на франтонах, на шаляваных сценах, на выступах шаляваных вуглоў, на брамах, ліштвах, надганкавых шчытах. У некаторых выпадках ромбы і квадраты маюць дадатковыя прамяні ў выглядз вузкіх стрэл, трохкутнікаў, выцягнутых ромбаў [3].

Асабліва цікавіць даследчыкаў аздабленне ліштваў сонечнымі знакамі. На кожнай асобнай плоскасці іх размяшчалі па 1–3, а часам гэтымі дэталямі аздаблялі па замкнёнаму прамавугольніку ўсе плоскасці. У даўнія часы падобнае размяшчэнне сімвалаў сонца не з'яўлялася прыхамаццю майстра. У дэкоры акна адбілася народнае ўяўленне аб кругабегу сонца вакол зямлі, аб жаданым святле і цеплыні ў хаце. Кругі, дыскі, разеткі, ромбы і разеткі з прамянямі або без іх, размешчаныя вакол акна, стваралі ўраджанне кругавога руху сонца.

Кругавое, трайное і адзінае размяшчэнне сімвалаў сонца на ліштвах, якое адпавядала раніцы, поўдню і вечару, характэрна амаль для ўсяго народнага дойлідства Беларусі, за выключэннем заходніх раёнаў, дзе салярныя знакі размяшчаліся галоўным чынам на франтоне. Адметныя асаблівасці мае дэкор паўночнага ўсходу Гомельскай вобласці, дзе ажурныя сімвалы сонца ў выглядзе празрыстых разетак уплятаюцца ў раслінныя матывы верхняй, больш старажытнай часткі ліштваў.

Багата і разнастайна прадстаўлены сімвал сонца на веснічках і брамах. Для Гомельшчыны характэрнае распаўсюджанне падобных матываў у выглядзе ярка расфарбаваных ромбаў. Ромб і квадрат у якасці дэкаратыўнага элемента ў наш час вельмі распаўсюджаны на поўдні Гомельшчыны, на Міншчыне, Магілеўшчыне і Віцебшчэне [5].

Сучасная архітэктурная народная творчасць даўно ўжо страціла сэнсавую канву “ахоўнага” значэння сімвалаў, але бачанне прыгожага перадаецца ў спадчыну. На пытанне, дзеля чаго робяцца падобныя аздабленні або што яны азначаюць, майстры або гаспадары звычайна адказваюць: каб было прыгожа.

Задача ўсіх, хто звязаны ў наш час з будаўніцтвам і праектаваннем асобных дамоў і цэлых паселішчаў, – не разглядаць падобныя элементы дэкору, як нешта аджылае, старое, а уважліва ставіцца да рэгіянальнай архітэктурнай спадчыны і нават пры масавым праектаванні і будаўніцтве імкнуцца ствараць лакальна своеасаблівы дэкарытыўны воблік будынкаў. Менавіта цяпер, калі адбываецца вялікая перабудова калгаснай вескі, важна, каб эстэтычныя мясцовыя народныя традыцыі не зніклі бясследна, а ў мудрым майстэрстве народа, у стваральнай працы архітэктараў і мастакоў працягвалі сваё жыццё на радасць патомкам.

**Літаратура**

1. Никольский, Н.М. Дохристианские верования и культы днепровских славян. – М., 1929.

2. Нікольскі, М.М. Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераваннях беларускага сялянства. – Мінск, 1933.

3. Сербов, И.А. Поездки по Полесью 1911 и 1912 гг. – Вильно, 1914.

4. Даркевич, В.П. Символы небесных светил в орнаментике Древней Руси. – «Советская археология». – 1980. – № 4.

5. Матэрыялы экспедыцыйных паездак аўтара (І.П. Хіцько) па ўсіх раёнах Беларусі ў 70–90 гг. ХХ ст.

● ● ● ● ●

УДК 75.036(476.5)

## ПАМЯЦІ ТАЛЕНАВІТАГА МАСТАКА М.Ф. ГЛУШКО

***Шкут М.М.***
*ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

***Ключавыя словы:*** *мастацтва, эцюды, карціна, мастак-рэаліст, вясковыя краявіды, кампазіцыя, традыцыі.*

10 мая 1998 года датэрмінова абарвалася жыццё таленавітага жывапісца Міхася Федаравіча Глушко, жыццё мастака, поўнага росквіту і твоорчых здзяйсненняў. У гэтым годзе (2014) яму бы споўнілась 70 год. Здольны, працавіты, шматрагранны, мэтанакіраванымастак не паспеў стварыць занадта шмат. Але, тое што створана ім трывала ўвайшло ў скарбніцу віцебскай мастацкай школы.

Калі знаёмішся з творчасцю сябра Саюза мастакоў СССР жывапісца М. Глушко, міжвольна адчуваеш прывабнасць яго сціплай непрэтэнцыёзнай жывапіснай манеры, пазбаўленай эфекта і напышлівай прыўзнятасці. Мастак выношвае шмат задум, каб перадаць на палатне беларускі край, цудоўны край віцебшчыны з блакітнымі азёрамі і рэкамі.

З самага пачатку творчага шляху М. Глушко шмат працуе над тэматычнымі творамі. Тут і камерныя бытавыя матывы, і карціны, напісаныя на стыку жанра і партрэта, і станковыя трыпціхі, пейзажы. Аб’ядноўвае іх неуклоннае імкненне аўтара паказаць разгорнутую карціну народнага быта і народнага характара ў іх неразрыўных сувязях з вядучымі тэндэнцыямі нашай рэчаіснасці. А гэта адзначае, што мастак

Репозиторий ВГУ